# Службовыя часціны мовы

**ТЫП УРОКА**: сістэматызацыя ведаў.

# МЭТА:

- актуалізаваць, сістэматызаваць і паглыбіць веды па тэме “Службовыя часціны мовы” ;
- рыхтаваць вучняў да іспытаў у форме тэсціравання; навучыць прымяняць атрыманыя веды пры выкананні практычных заданняў

| | |
|---|---|
| 1 | Звязвае самастойныя словы адно з адным. Паказвае залежнасць назоўніка, лічэбніка і займенніка ад іншых слоў у сказе. |
| 2 | Звязвае аднародныя члены сказа, часткі ў саставе складанага сказа ці фрагменты тэксту. |
| 3 | Надае дадатковыя адценні словам ці сказам; служыць для ўтварэння некаторых формаў слова. |

# ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ

**1. Якімі часцінамі мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы. Адказ абгрунтуйце.**

- а)А мы **сабе** працягваем пісаць, не зважаючы на званок.
- б)Не кідай хлеба, **каб** ён цябе не кінуў.
- в)Бярыце канькі і **давайце** катацца разам
- г)Рыбак стараўся разгледзець што-небудзь **накшталт** лодкі.
- д)Стары сядзеў, тужліва **апусціўшы** галаву.

# 2.Выпішыце ў сшытак словазлучэнні.

- аркуш з надпісам,
- не забывай жа,
- паміж Прыпяццю і Дзвіной,
- паводле аповесці,
- забыты навек.

# 3. Выберыце ў дужках неабходны прыназоўнік. Чым кіраваліся пры выбары патрэбнага варыянта?

- а)(у,ва) узросце,
- б)(з,са) зборніка,
- в) (над,нада) мной,
- г)(з,са) шчырасцю,
- д)(у,ва) універмагу.

# 4. Падкрэсліце прыназоўнікі. Якія граматычныя асаблівасці прыназоўніка вы ўлічвалі?

- а). З дому насупраць выйшаў чалавек.
- б). Насупраць нашага дома працякаў ручай.
- в). Прыбыла дэлегацыя на чале з кіраўніком дзяржавы.
- г).Побач з алешнікам – чарот зялёны.
- д). Мы тут паблізу ходзім.

# 5. У якіх сказах у правапісе прыназоўнікаў дапушчаны памылкі? Запішыце іх правільна.

- а) З-за лесу выплывала цёмная хмара.
- б). Не гледзечы на позні час, школа жыла сваім звычайным жыццём. в)У паветры над мною кружылі буслы.
- г) З станцыі Васіль ішоў ажно пяць кіламетраў.
- д)Дзякуй небу, сонцу, зорам па - над роднаю зямлёй.

6. Падкрэсліце часціцы. Якія граматычныя і сінтаксічныя функцыі ўласцівы часціцам?
Якія дадатковыя адценні часціцы могуць надаваць моўным адзінкам?

- а)Дзеці цэлы дзень адно гуляюць.
- б) Ідзе сабе, нікога не чапае.
- в) Гэтага якраз я і хацеў.
- г)Ён прыедзе толькі заўтра.

# 7. Запішыце часціцы асобна, разам або праз злучок.

- Даволі (такі) часта ішлі дажджы. (Такі) сказаў праўду. Мы ўсё (ж) такі спяшаліся. Вучыцца пакуль (што) было лёгка. Ёй (абы) пагаварыць.

# 8. Выберыце неабходную часціцу, напішыце яе разам або асобна.

- а) Якія тут рэцэпты (не,ні) пішы, (не, ні) якая (не,ні) выручыць аптэка.
- б)Няхай жа ў нашыя дзверы (не,ні) разу (не,ні) грукне зіма.
- в) Гукае нас жывымі галасамі яшчэ (не, ні) знаны і дзівосны свет.
- г)Але (не,ні) дзе пазбыцца (не,ні) магчыма (не,ні) клопатаў, (не,ні) радасных турбот.
- д) З дарогі адкрываўся (не,ні) абсяжны далягляд

# 9. Падкрэсліце нарматыўныя словазлучэнні.

- Паехаць на млын – паехаць у млын, перамалоць у муку – перамалоць на муку, вярнуцца па ключы – вярнуцца за ключамі, падняцца на поўны рост – падняцца ў поўны рост.

# 10. Складзіце словазлучэнні.

| | | |
|---|---|---|
| камандаваць | | |
| смяяцца | | |
| зневажаць | + слабы | |
| здзекавацца | | |
| кпіць | | |

11. Складзіце пары міжмоўных эквівалентаў з наступных беларускіх і рускіх прыназоўнікаў. Пры адсутнасці дакладнага адпаведніка падбярыце сінанімічны. Складзіце з імі словазлучэнні.

| | |
|---|---|
| 1. Абапал | 1. Благодаря |
| 2. Да | 2. В течение |
| 3. З нагоды | 3. Насчёт |
| 4. У адносінах да | 4. По обеим сторонам |
| 5. Дзякуючы | 5. По поводу |
| 6. На працягу | 6. Вследствие |
| 7. Наконт | 7. По отношению к |
| 8. У выніку | 8. Рядом с |
| 9. Поруч з | 9. О |
| 10. Па | 10. За |
| 11. Пра | 11. К |

12. Выберыце правільныя варыянты адпаведнікаў у беларускай і рускай мовах.

- а) В трёх километрах от города-за тры кіламетры ад горада;
- у меня болит голова – мне баліць галава ;
- топить печь – паліць у печы ;
- б) минуты две – хвіліны са дзве ;
- разговор о матери – размова а маці;
- плыть по морям – плысці па морам;
- в) думать о нём – думаць пра яго;
- послать за доктором – паслаць па доктара;
- они дружнее всех – яны дружнейшыя за ўсіх.

# Маналог палігрыма

Нялёгка ісці па знявечанай зямлі. Іншы раз боязна нават збочыць з дарогі – каб адпачыць і наталіць смагу. Боязна дакрануцца да кветкі. Боязна ўзяць ягадзіну. Боязна падняць грыб. Урэшце, боязна дыхаць.! Бо ўсё гэта – паветра, грыб, ягадзіна, кветка, вада – робіцца атрутай.

Чорнае крыло Чарнобыля вісіць нада мною, над маёю дарогаю – над усёй зямлёю. .. Узмах таго крыла – і вунь колькі жыццяў на валасінцы. Узмах таго крыла – і вунь колькі песень не спета. Узмах таго крыла – і вунь колькі кветак не бачыць сонца. ..

А я іду. І не хачу , каб за наступнай павароткай скончылася мая дарога.

Я. Пархута.

***

Я ведаю добра

Заданні выклікалі цяжкасці

Над гэтым трэба працаваць